МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ**

вул. Ракаўская, д. 17, 220004, г.Мінск
тэл./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк»
па г.Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ**

ул. Раковская, д. 17, 220004, г.Минск
тел./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»
по г.Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

20.12.2024 № 1-5/167

на № ____________ ад ____________

[redacted]

Аб разглядзе звароту

[redacted]

Упраўленне культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта разгледзела Ваш калектыўны электронны зварот ад 10.12.2024 № 6-7-1378/15 эл.кол. па пытанні прысваення адной з вуліц горада Мінска імя беларускага паэта Рыгора Барадуліна, паступіўшы ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, і ў рамках кампетэнцыі паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь «О наименованиях географических объектов» ад 16.11.2010 № 190-З (далей – Закон) прысваенне найменаванняў састаўным часткам г.Мінска (элементы вулічна-дарожнай сеткі і прыраўнаваныя да іх элементы горадабудаўнічай планіровачнай структуры) і іх перайменаванне ажыццяўляе Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

Артыкулам 20 Закона вызначана, што прапановы аб прысваенні найменаванняў састаўным часткам населеных пунктаў і іх перайменаванні могуць уносіць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі, а таксама грамадзяне пасля правядзення па гэтым пытанні мясцовага сходу або мясцовага рэферэндуму. Прапановы павінны ўтрыліваць абгрунтаванне неабходнасці прысваення найменавання або перайменавання.

Прапановы аб найменаванні састаўных частак г.Мінска, якія накіроўваюўцца ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, перадаюцца ў камісію па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак г.Мінска (далей – камісія), створаную ў мэтах ажыццяўлення каардынацыі па фарміраванні адзінага падыходу да найменавання састаўных частак г.Мінска.

Пытанне аб прысваенні імя Рыгора Барадуліна адной з вуліц у г.Мінску можа быць разгледжана камісіяй ва ўсталяваным заканадаўствам парадку пры наяўнасці зваротаў забудоўшчыкаў тэрыторый горада,

адміністрацый раёнаў г.Мінска, РУП «Мінскае гарадское агентства па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры», іншых арганізацый.

Дадаткова паведамляем, што імя Рыгора Барадуліна ўключана ў спіс прапаноў па найменаванні новых вуліц сталіцы.

Дадзены адказ можа быць абскарджаны ў адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» у вышэйстаячай арганізацыі або ў судовым парадку.

Начальнік упраўлення К.П.Лучына

Лось 272 43 45